# Супрацоўніцтва з установамі культуры

23 жніўня 2019 года наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" ў рамках мерапрыемстваў прысвечаных да 75-годдзя Гродзенскай вобласці наведалі персанальную выставу "Кветкавы рай" беларускай мастачкі Ядвігі Сянько у Ашмянскім краязнаўчым музеі ім. Ф. К. Багушэвіча. Прадстаўленая выстава - "гэта праца і душы, і рук, і розуму, як сцвярджае сама мастачка", - не змагла нікога пакінуць абыякавым. Свае станоўчыя ўражанні ад экспазіцыі і словы падзякі наведвальнікі пакінулі ў кнізе водгукаў.

Супрацоўніцтва з установамі культуры дае нам магчымасць даведацца шмат новага і цікавага пра таленавітых людзей, якія нарадзіліся і жывуць у нашай Беларусі!



